# У ПЕРШЫЯ МЕСЯЦЫ ВАЙНЫ

У газеце «Гомельская праўда» 25 снежня 1979 года быў апублікаван артыкул «Аднапалчане просяць адгукнуцца». У ім прыведзены новыя звесткі аб подзвігах савецкіх людзей у барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі; гаварылася аб тым, што многія чытачы ў сваіх пісьмах просяць дапамагчы знайсці родных, знаёмых, аднапалчан, устанавіць месцы гібелі блізкіх — воінаў, партызан, падпольшчыкаў.

Вось адно з іх: «Мы, камсамольцы штаба «Пошук», устанаўліваем баявы шлях 151-й стралковай дывізіі. Яна сфарміравана ў чэрвені 1941 года ў Палтаўскай вобласці. Яе баявое хрышчэнне адбылося на Гомельшчыне ў 1941 годзе. Камандаваў тады дывізіяй генерал-маёр В. І. Нярэцін. Мы просім адгукнуцца яе ветэранаў і тых, хто што-небудзь ведае аб гэтай дывізіі, яе воінах, і паведаміць па адрасу: «Палтаўская вобласць, г. Лубны, вул. Кузіна, 1, РК ЛКСМУ».

З падобнымі пісьмамі звяртаюцца юныя следапыты, актывісты музеяў народнай славы.

У архіве Міністэрства абароны СССР нам удалося знайсці рад дакументаў, на якіх можна даць адказ чытачам на некаторыя пытанні.

151-я стралковая дывізія ўваходзіла ў састаў 67-га стралковага корпуса 21-й арміі. У аператыўнай зводцы ад 6 ліпеня 1941 года запісана, што дывізія 5 і 6 ліпеня прыбыла і сканцэнтравалася ў раёне Добруша. Потым яна выйшла на рубеж Яроміна, Краснае, Мільча, Нова-Беліца і прыступіла да стварэння абароны.

У перыяд сканцэнтравання на ўказаным рубяжы ў яе часцях быў зачытан загад камандуючага 21-й арміяй, дзе абагульняўся вопыт жорсткіх баёў на рубяжы Жлобін-Рагачоў. У ім гаварылася, што доблесныя часці арміі па ўсяму фронту спынілі наступленне праціўніка. Фашысты прадпрынялі некалькі рашучых спроб фарсіраваць Днепр, але пацярпелі паражэнне. У загадзе падкрэслівалася: напружаныя баі паказалі, што гітлераўцы на радзе ўчасткаў не вытрымліваюць удара нашых войск. За адзін толькі дзень 5 ліпеня нашы часці тройчы адкідвалі ў раку і знішчалі ворага, які спрабаваў заняць усходні бераг Дняпра.

Загад патрабаваў і заклікаў: «Наша задача нанесці рашучае паражэнне войскам праціўніка... Перамога будзе за намі! Уперад на ворага!»

Байцы, камандзіры і палітработнікі выказвалі сваю рашучасць самаадданна змагацца з ворагам. Так, чырвонаармеец 1-й стралковай роты 581-га стралковага палка Карцаў сказаў: «Я буду біцца, да апошняй кроплі крыві. Не стане патронаў — буду біцца штыком і лапатай»...

У хуткім часе дывізія атрымала загад выйсці на новы рубеж абароны Малінаўка, Ямнае, Сычман, бо 13 ліпеня часці 63-га корпуса арміі павінны былі перайсці ў наступленне з раёна Рагачова — Жлобіна ў напрамку на Бабруйск. Неабходна было прыкрыць правы фланг наступаючых. Да раніцы 13 ліпеня 151-я і іншыя дывізіі 67-га стралковага корпуса пасля цяжкага маршу занялі абарону на ўказаным рубяжы і тым самым прыкрылі правы фланг арміі ад удару буйной групоўкі фашыстаў.

Тут неўзабаве быў атрыман загад перайсці ў наступленне ў напрамку населеных пунктаў Вець і Бахань. У баях чырвонаармейцы, камандзіры, палітработнікі праяўлялі мужнасць і гераізм. Так, сержант 519-га палка камсамолец А. Д. Небывайла ўмела кіраваў дзеяннямі свайго кулямётнага разліку. Падпусціўшы праціўніка на блізкую адлегласць, расстраляў многіх фашыстаў ва ўпор.

У той час, калі 63-ці стралковы корпус вызваляў гарады Жлобін і Рагачоў, а затым рухаўся на Бабруйск, часці 67-га стралковага корпуса, у тым

ліку і 151-я дывізія, паспяхова вялі баі на правым флангу.

У зводцы 23 ліпеня паведамлялася, што 151-я дывізія паспяхова стрымлівала праціўніка на рубяжы вёсак Вець, Зацішша, Іскань, Бахань і далей па беразе ракі Гутлянка. Але гітлераўцы кінулі сюды свае новыя вялікія сілы і пацяснілі нашы войскі на ўсход. Трэба было сарваць задумы ворага.

У баявым распараджэнні камандуючага 21-й арміі на 30 ліпеня гаворыцца: 67-му стралковаму корпусу ў саставе 155-й, 151-й, 102-й стралковых дывізій мець асноўную групоўку на правым флангу, наступаць раніцай 31 ліпеня з задачай разграміць праціўніка і да зыходу дня авалодаць рубяжом Іскань, Бахань, Паляновічы, вышыней 152,9; у далейшым наступаць на Лужкі. Мяжа злева — Свержань, Азяране.

Жорсткія баі вяла 151-я стралковая дывізія ў раёне лесу «Заазер'е», гаю на поўнач ад вёскі Пахар і вёскі Плоскае. У палітданясенні паведамлялася аб подзвігах чырвонаармейцаў і камандзіраў. Так, паранены лейтэнант Гваздзенка працягваў кіраваць узводам і асабіста знішчыў пяць фашыстаў. Чырвонаармеец Васільеў прямой наводкай 45-міліметровай гарматы знішчыў групу фашысцкіх матацыклістаў, прымусіў замаўчаць станкавы кулямёт і двух аўтаматчыкаў.

У ходзе баёў дывізія атрымала папаўненне, у тым ліку з Гомеля і вобласці. У яе часці было накіравана больш за 100 камуністаў.

У данясеннях з дасцей неаднаразова называюцца прозвішчы палітрукоў Кочатава, Антонава і Плотнікава, якія знаходзіліся ўвесь час у радах чырвонаармейцаў 1-й, 8-й і 9-й батарэй і правесці палітыка-выхаваўчую работу. Яны ўмацоўвалі ў воінаў адвагу, веру ў перамогу.

Чырвонаармеец і 464-га артпалка, член ВЛКСМ Калешка па стану свайго здароўя быў не страявым і служыў пісарам. Ен напісаў рапарт і папрасіў перавесці яго ў батарэю, у гарматны разлік. У рапарце ён пісаў: «Мой абавязак, мой доўг быць там, дзе праліваюць кроў мае таварышы, дзе лепшыя сыны Радзімы б'юцца з каварным ворагам». Далей ён прыводзіць словы з пісьма маці да яго: «Мне маці піша: «Сын мой, Айчына заклікала цябе абараняць яе. З гонарам апраўдвай званне камсамольца, званне воіна слаўнай Чырвонай Арміі. Бі ворага так, як біў яго твой бацька ў грамадзянскую вайну, як б'юць яго цяпер твае чатыры браты. Памятай, што для мяне лепш быць маці загінуўшага героя, чым маці баязліўца».

У архіўных дакументах ёсць звесткі аб тым, колькі было камуністаў у падраздзяленнях, аб папауненні партыйных арганізацый прынятымі ў члены і кандыдаты партыі. Арганізуючая, выхаваўчая і натхняючая роля камуністаў — як прадстаўнікоў партыі — дапамагала абаронцам Радзімы вытрымліваць неверагодныя велізарныя цяжкасці першых дзён вайны, лютага націску фашыстаў.

З 1-га па 6 жніўня 151-я дывізія ўдасканальвала сваю абарону, адбівала атакі праціўніка і праводзіла перагрупоўку часцей. З 6-га жніўня пачаліся жорсткія баі за вёску Іскань. У гэты ж дзень другі бальён 683-га стралковага палка пайшоў у контрнаступление, заняў частку гэтай вёскі і ўтрымліваў яе да 8 жніўня. У баі асабліва вызначылася пятая рота на чале з камандзірам лейтэнантам Коржам і палітруком Захаравым.

151-я стралковая дывізія 7 жніўня змяніла часці 155-й стралковай дывізіі і сваімі палкамі займала рубеж: Міхайлаўка, Хатоўня, Плоскае, Журавічы.

Да 8 жніўня праціўнік на Жлобінскім, Рагачоўскім і Доўскім напрамках сканцэнтраваў буйную групоўку войск. Маючы вялікую перавагу ў жывой сіле і тэхніцы, асабліва ў

танках і авіяцыі, гітлераўскім войскам удалося прарваць нашу абарону на ўчастку Доўск — Прапойск (цяпер — Слаўгарад). Нашы войскі, у тым ліку і 151-я дывізія, вымушаны былі адступаць, стрымліваючы націск праціўніка.

Нельга без хвалявання чытаць аператыўную зводку 21-й арміі за 11 жніўня, дзе паведамлялася з Чачэрска, што генерал Нярэцін з часткай сіл дывізіІ на працягу дня вёў ўпартыя, кровапралітныя баі. Пад націскам праціўніка нашы падраздзяленні адышлі на рубеж Папаратнае, Старая Каменка, Закрэў і занялі абарону. Генерал-маёр Нярэцін прасіў і чакаў дапамогі з рэзерваў. У данясенні сказана аб цяжкім становішчы войск 67-га стралковага корпуса. Яму пагражаў праціўнік з правага флангу і тылу, з боку вёсак Мормаль і Забродзе.

Да 12 жніўня ўключна часці 21-й арміі вялі баі з наступаючым праціўнікам на ўсім фронце, ад Прапойска (Слаўгарад) да Жлобіна. У гэты ж дзень была праведзена частковая перагрупоўка нашых войск, а 451-я дывізія вяла баі ў наваколлях вескі Валасовічы.

67-мы корпус 13 жніўня атрымаў задачу перайсці ў наступление ў напрамку на вёску Рэкта Рагачоўскага раёна. 151-я дывізія павінна была наступаць на гэты пункт з боку Валасовіч.

14 жніўня ў баявым данясенні камандуючага 21-й арміяй паведамлялася: 67-мы стралковы корпус з раніцы разам з прыбыўшай 167-й стралковай дывізіяй атакаваў ворага ў напрамку Журавічы, Рэкта. Але фашысты сканцэнтравалі тут свае сілы, перайшіі ў наступленне. Праціўнік з 5 гадзін раніцы да 20 гадзІн вечара праявіў выключную актыўнасць у паветры і на зямлі, кінуў у бой многа самалётаў, танкаў, мотастралковых часцей. Нашы войскі на гэтым участку фронту вымушаны былі адступіць у раён вёскі Меркулавічы. Да 16 жніўня паступалі звесткі аб цяжкіх баях 151-й дывізіі, у тым ліку ля вёскі Рэкта. Са значнымі стратамі, адбіваючы ярасны націск ворага, яна адыходзіла на ўсход.

19 і 20 жніўня часці і злучэнні 67-га стралковага корпуса сумесна з народным апалчэннем вялі цяжкія абарончыя баі за Гомель.

Такім чынам, 151-я стралковая дывізія, якая была сфарміравана на Палтаўшчыне, унесла нямалы ўклад у абарончыя баі на Гомельшчыне, у зрыў гітлераўскіх планаў «маланкавай вайны». Яна разам з іншымі злучэннямі Чырвонай Арміі паспяхова змагалася з ворагам да поўнага яго разгрому.

**І. Парфёнаў, дацэнт Гомельскага каапературатыўнага інстытута**